НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

**БЕЛАРУСЬ
ПРАЗ ПРЫЗМУ
РЭГІЯНАЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ**

# Талачынскі край:
## гісторыка-культурная спадчына рэгіёна

*Зборнік навуковых артыкулаў*

Мінск
«Беларуская навука»
2024

УДК 94(476.5)(082)
ББК 63.3(4Беи)я43
Т16

*Серыя заснавана ў 2018 годзе*

Укладальнікі:

кандыдат гістарычных навук А. В. Бараноўскі,
магістр гістарычных навук Д. А. Крэнт

Рэдакцыйная калегія:

В. Л. Лакіза (галоўны рэдактар), А. В. Бараноўскі (адказны рэдактар),
Д. А. Крэнт, В. Г. Мазец, М. У. Смяховіч, І. У. Спірын, С. А. Трацяк

Рэцэнзенты:

кандыдат гістарычных навук, дацэнт П. А. Трубчык,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. М. Дулаў

*Зборнік падрыхтаваны ў рамках выканання Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2021–2025 гг. «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» (навуковы кіраўнік – акадэмік НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя) падпраграмы № 1 «Гісторыя» (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. Л. Лакіза)*

**Талачынскі край** : гісторыка-культурная спадчына рэгіёна : зб.
Т16 навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад.: А. В. Бараноўскі, Д. А. Крэнт ; рэдкал.: В. Л. Лакіза [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2024. – 491 с. – (Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі).
ISBN 978-985-08-3135-4.

Зборнік навуковых артыкулаў уключае матэрыялы, прысвечаныя праблемам палітычнай, сацыяльнай, эканамічнай і культурнай гісторыі Талачыншчыны, якія прайшлі апрабацыю на навукова-практычнай канферэнцыі «Талачынскі край: гісторыка-культурная спадчына рэгіёна (да 590-годдзя першай згадкі Талачына ў пісьмовых крыніцах)», што адбылася ў чэрвені 2023 г. у г. Талачыне Віцебскай вобласці.

Разлічаны на вучоных, студэнтаў, настаўнікаў, краязнаўцаў і ўсіх тых, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

Меркаванні аўтараў могуць не супадаць з меркаваннем рэдкалегіі.

**УДК 94(476.5)(082)**
**ББК 63.3(4Беи)я43**

**ISBN 978-985-08-3135-4**

© ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі», 2024
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2024

**Юпатов Антон** *(Витебск).* Детские дома Толочинского района в 1945–1955 гг. .... 283

**Жыхарка Жанна, Мельнікаў Мікалай** *(Мінск).* Помнікі сакральнага мастацтва Талачыншчыны (па матэрыялах навуковых экспедыцый) .................... 298

**Пікулік Ірына** *(Талачын).* Фарміраванне калекцыі ручнікоў Талачынскага гісторыка-краязнаўчага музея .................... 308

**Юрчак Дзяніс** *(Віцебск).* Гісторыка-культурныя каштоўнасці Талачынскага раёна ў другой палове XX – пачатку XXI ст. .................... 313

**Ивченко Дмитрий** *(Толочин).* Народная киностудия «Летопись» как средство популяризации туристического и краеведческого потенциала Толочинского района .................... 321

**Півавар Мікалай** *(Віцебскі раён).* Сімвалы і коды Талачынскага краю .......... 326

**Лавринович Виктория, Гавриловец Людмила** *(Мозырь).* Перспективы развития гастрономического туризма в Толочинском районе .................... 333

**Слесарава Марыя, Унучак Андрэй, Анофранка Наталля, Драгун Анастасія, Бакуновіч Андрэй, Павуціна Марыя, Гецэвіч Юрый** *(Мінск).* Турыстычны і краязнаўчы патэнцыял Талачынскага краю з аўдыягідам KrokApp .................... 336

## ЗВЯЗАНЫЯ ЛЁСАМ З ТАЛАЧЫНШЧЫНАЙ

**Урублеўскі Вадзім** *(Мінск).* Войны-Ясянецкія з Талачыншчыны – продкі Свяціцеля Лукі, архіепіскапа Крымскага .................... 341

**Шаладонаў Ігар** *(Мінск).* Маральна-духоўны патэнцыял прозы М. Зарэцкага ..... 350

**Мазец Валянцін** *(Мінск).* Іх лёс быў звязаны з Талачынскім краем: з жыцця і дзейнасці дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР першага склікання .................... 358

**Комар Евгений** *(Минск).* «Сэрцам адданыя роднай зямлі»: Герой Советского Союза Петр Антонович Галецкий .................... 362

**Гарматный Виталий** *(Минск).* Тамара Павловна Бирюкова – персональный пенсионер республиканского значения .................... 368

**Бондарева Елена** *(Витебск).* Пашкевич Никифор Евдокимович – литературовед, писатель, заслуженный деятель культуры БССР .................... 371

**Паляшчук Наталля** *(Мінск).* А. І. Жураўскі – асоба, вучоны, педагог ........... 374

**Перавалава Наталля** *(Мінск).* А. І. Жураўскі і «Гістарычны слоўнік беларускай мовы» .................... 384

**Ярмоленка Эльвіра** *(Мінск).* З навуковай спадчыны А. І. Жураўскага ............ 386

**Галыга Алеся** *(Талачын).* Герой Беларусі – мастак М. А. Савіцкі .............. 392

**Жукова Оксана, Богомолова Ольга, Тищенко Милана** *(Минск).* Малая родина в жизни и творчестве Михаила Савицкого .................... 398

**Дубовик Александр** *(Минск).* Эдуард Корнилович – толочинский краевед, писатель, историк, политолог-энциклопедист Беларуси .................... 410

**Баранава Ала** *(Мінск).* Выхаваўчы патэнцыял лірыкі Веры Вярбы.................... 421

**Лапата-Загорскі Аляксандр** *(Мінск).* Алесь Петрашкевіч – кіраўнік першай экспедыцыі «Дарога да Святыняў» .................... 432

**М. М. Слесарава, А. У. Унучак, Н. В. Анофранка, А. Я. Драгун, А. А. Бакуновіч, М. А. Павуціна, Ю. С. Гецэвіч** *(г. Мінск)*

# ТУРЫСТЫЧНЫ І КРАЯЗНАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ТАЛАЧЫНСКАГА КРАЮ З АЎДЫЯГІДАМ KROKAPP

Невялікі па колькасці насельніцтва (28,4 тыс. чал) і тэрыторыі (у раён уваходзяць 272 населеныя пункты, плошча – 1,5 тысячы км²) Талачынскі край багаты разнастайнымі славутасцямі. Размешчаны на паўднёвым усходзе Віцебскай вобласці, ён мяжуе з Сенненскім і Аршанскім раёнамі Віцебскай вобласці, Магілёўскай і Мінскай вобласцямі, а магістраль М1/Е30 Брэст-Масква садзейнічае прытоку наведвальнікаў і турыстаў.

Згодна афіцыйным даным[1], прадстаўленымі Талачынскім раённым выканаўчым камітэтам, на тэрыторыі Талачынскага края знаходзіцца 33 нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. З іх 22 помнікі археалогіі, 8 помнікаў архітэктуры, 3 помнікі гісторыі. Трыццаць помнікаў адносяцца да 3-й катэгорыі гісторыка-культурных каштоўнасцей і маюць асаблівую значнасць для раёна.

Найбольш вядомымі мясцінамі з’яўляюцца *Царква Пакрова Прасвятой Багародзіцы і Свята-Пакроўскі манастыр* і *Касцёл святога Антонія Падуанскага* (гэты будынак уключаны ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь). Аднак для ўсіх аматараў гісторыка-культурных каштоўнасцей будуць цікавыя такія месцы, як *Талачынскі гісторыка-краязнаўчы музей, Млын вадзяны, Гіпербалоідная вежа Шухава* (прызнана гісторыка-культурнай каштоўнасцю), *Каменны крыж* (в. Галошава на беразе возера Глыбокае), *Слуп цагляны* (в. Ганчароўка). Асобую важкасць мае гарадзішча ў Друцку, якое лічылася старажытным горадам Полацкай зямлі

[1] Туризм // ТОЛОЧИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ [Электронный ресурс]. – 2023. Режим доступа : https://tolochin.vitebsk-region.gov.by/ru/turizm/. – Дата доступа : 26.03.2023.

з X ст. па XVI ст. на р. Друць. Тут праходзіла заходняе адгалінаванне знакамітага шляху «З варагаў у грэкі». Гэта адзінае месца ў рэспубліцы, дзе прысутнічаюць усе часткі горада ранняга сярэднявечча: дзяцінец, вакольны горад, пасад, земляныя валы, роў і курганны могільнік. У 2001 годзе на гарадзішчы быў усталяваны памятны знак у гонар 1000-годдзя Друцка.

Сярод турыстаў асабліва папулярныя маршруты для наведвання ландшафтаў і архітэктурных помнікаў. Гэта фрагменты будынкаў ранейшых маёнткаў памешчыкаў *Хамянтоўскіх, Гардзелкаўскіх, графа Замойскага, баранэсы Анхен*, старадаўнія паркі ў вёсцы Рацэва, Забайкал, *старажытны маёнтак Юзэфполле*. У раёне папулярны паляўнічы турызм, які развіваецца на базе Рацаўскай старадаўняй сядзібы. Распрацаваны таксама конныя, пешыя і велатурысцкія маршруты: да гарадзішча старажытнага Друцка, па гістарычных мясцінах раёна, Віцебскай вобласці і Рэспубліцы Беларусь. Акрамя таго, жыхары і госці Талачынскага краю маюць магчымасць наведаць і пазнаёміцца з працай такіх прадпрыемстваў, як *«Амкадор-КЭЗ»* і Каханоўскі трубны завод *«Белтрубпласт»*.

Якасным дапаможнікам у наведванні падобных славутасцей не толькі ў Талачынскім краі, але і ва ўсёй Рэспубліцы Беларусь, паслужыць інтэрактыўны аўдыягід *KrokApp*[2]. Гэта зручны інструмент для пошуку, пракладання маршруту і самастойнага знаёмства з разнастайнымі аб’ектамі гісторыка-культурнай значнасці, пачынаючы ад будынкаў духоўнай спадчыны, абарончых збудаванняў і завяршаючы помнікамі гістарычным асобам, падзеям, персанажам і інш. Распрацоўшчыкі IT-платформы KrokApp (супрацоўнікі лабараторыі распазнавання і сінтэзу маўлення АІПІ НАН Беларусі[3] і спецыялісты Інстытута гісторыі НАН Беларусі) стварылі тры версіі аўдыягіда. Гэта Web-версія платформы і дзве мабільныя версіі для Android у

[2] KrokApp — персанальны аўдыягід па гарадах Беларусі // [Электронны рэсурс]. — 2023. Рэжым доступу : http://krokapp.by/. — Дата доступу : 26.09.2022.
[3] Лабараторыя распазнавання і сінтэзу маўлення // [Электронны рэсурс]. – 2023. Рэжым доступу: https://ssrlab.by/. – Дата доступу : 28.02.2023.

Play Market[4] і iOS[5] для смартфонаў. KrokApp дазваляе праслухаць цікавыя факты, практычную інфармацыю і карысныя падказкі падчас руху карыстальніка на а чатырох мовах: беларускай, рускай, англійскай і чэшскай (малюнак 1). Таксама рыхтуецца прататып на кітайскай мове.




**Малюнак 1 – Інтэрфейс android-версіі KrokApp**

Прыкладны сцэнарый выкарыстання інтэрактыўнага аўдыягіда KrokApp можа выглядаць наступным чынам. Турыст Ян робіць перасадку ў Мінску з цягніка на самалёт, у яго ёсць вольных 10-20 гадзін часу. KrokApp прапаноўвае яму пэўную колькасць кропак для наведвання адносна пазначанай колькасці вольных гадзін Яна. Дадаткова, калі Ян адзначыць жаданне падмацавацца і нешта набыць – KrokApp скарэктуе маршрут адпаведным чынам. У наступны раз турыст Ян можа вырашыць наведаць іншы горад Беларусі, у гэтым будзе яму рады дапамагчы прадстаўленае прыстасаванне, прапаноўваючы прагляд ужо вядомых ці новых цікавых мясцін згодна жаданню Яна. Так, аўдыягід дазваляе абраць колькасць свабоднага часу і тыя славутасці, якія зацікавілі

[4] KrokApp // GooglePlay [Электронны рэсурс]. – 2023. Рэжым доступу : https://play.google.com/store/apps/details?id=by.ssrlab.krokapp. – Дата доступу : 03.03.2023.
[5] KrokApp // AppStore [Электронны рэсурс]. – 2023. Рэжым доступу : https://apps.apple.com/us/app/krokapp/id1498624840. – Дата доступу : 03.03.2023.

карыстальніка. Далей адбываецца пабудова карыстальніцкага маршруту з дапамогай GPS-тэхналогіі з улікам колькасці адзначанага часу. Такая функцыя прадстаўлена ў Android-версіі. Кожная кропка суправаджаецца аўдыя- і тэкставай інфармацыяй, што спрыяе засваенню толькі важных і цікавых фактаў замест груваздкіх паведамленняў.

ІТ-платформа KrokApp распрацавана з мэтай забеспячэння простага сэрвісу па прадстаўленні гісторыі, культуры і турыстычнага патэнцыялу гарадоў і мясцін замежнікам. З дапамогай аўдыягіда вырашаецца адна з галоўных праблем беларускага турызму: павышэнне ўзроўню нацыянальнай асветы грамадзян Беларусі і прасоўванне вядомых і малавядомых рэгіянальных аб'ектаў культурнай і гістарычнай значнасці. У Беларусі налічваецца 118 раёнаў, 115 гарадоў, 85 пасёлкаў і 23065 сельскіх населеных пунктаў. Пра кожны з іх можна распавесці сучаснымі сродкамі больш шырокай аўдыторыі – як замежным турыстам, так і жыхарам саміх населеных пунктаў. Па выніках апытання адвольных мінакоў – з 20 інфармантаў толькі 1 чалавек быў здольны назваць славутасці, якія знаходзяцца не ў адным горадзе, а па меншай меры, у 5 розных населеных пунктах Беларусі.




**Малюнак 2 – Мапа з адзначэннем турыстычных аб’ектаў РБ на афіцыйным сайце аўдыягіда KrokApp**

Колькасць гарадоў, пра якія можна даведацца праз мабільныя праграмы (не аўдыягіды), якія размешчаны ў краме мабільных праграм Google Play, да 20. Менш за 10 мабільных праграм – з аўдыякантэнтам па вялікіх гарадах

Беларусі. На дадзены момант KrokApp – гэта адзіная платформа, якая сабрала і зручна прадставіла гістарычную і культурную інфармацыю пра гарады Беларусі. На сённяшні дзень аўдыягід прадстаўляе апісанне славутасцей 84 гарадоў, менавіта 497 кропак (малюнак 2).

Інтэрактыўны аўдыягід знаходзіцца ў бесперапыннай дапрацоўцы. Распрацоўшчыкі працуюць над пастаянным абнаўленнем версій, дабаўленнем новых аб'ектаў з іх верыфікаваным тэкставым і агучаным апісаннем на пяці мовах. Так, у апошнім часе з'явіліся турыстычныя кропкі ў Слоніму, Барысаве, Рагачове, Баранавічах. Агучаны ўжо наяўныя апісанні гісторыка-культурных каштоўнасцей у Сянно, Мінску, Гродна. У планах таксама ўкараніць сістэму аўтаматычнага ўключэння карысных паведамленняў ад KrokApp пра славутасці мясцін па ходзе руху карыстальніка. Найважнейшай задачай прыстасавання з'яўляецца адаптацыя кантэнту KrokApp для іншых моў, менавіта, польскай, украінскай, літоўскай, латышскай, нямецкай і іншых. Гэта будзе садзейнічаць прыцягненню замежных наведвальнікаў Рэспублікі Беларусь і папулярызацыі славутасцей, традыцый і культурных каштоўнасцей краіны. Для спрашчэння працэдуры агучвання тэкставага апісання прафесійнымі дыктарамі плануецца ўбудаванне беларускамоўных сістэм сінтэзу маўлення[6], што значна зменшыць час на падрыхтоўку і выстаўленне ў прыстасаванне асобнага аб'екта і скароціць працоўны час дыктара. Распрацоўшчыкі таксама імкнуцца да ўсталявання доўгатэрміновых кантактаў з прафесійнымі гісторыкамі, экскурсаводамі, этнографамі, журналістамі, фатографамі, дыктарамі для стварэння якаснага кантэнту KrokApp. Гэта паспрыяе арганізацыі магчымасці дадання ўласнай інфармацыі ў KrokApp для экскурсаводаў, краязнаўцаў, гісторыкаў і іншых карыстальнікаў. Экскурсаводы змогуць атрымаць дадатковую магчымасць заробку, дзякуючы размяшчэнню платнага кантэнту ў KrokApp.

---

[6]Сінтэзатар маўлення па тэксце [Электронны рэсурс]. – 2018. Рэжым доступу : http://corpus.by/TextToSpeechSynthesizer/?lang=be. – Дата доступу : 29.03.2023.